Весці БДПУ. Серыя 2. 2025. № 2. С. 14–21

УДК [930:351](476)“17/19”

# ЭВАЛЮЦЫЯ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ І КІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

**А. П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
ORCID: *https://orcid.org/0000-0002-4750-1772;*

**С. А. Талмачова,**
*доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6708-0282*

Паступіў у рэдакцыю 02.06.2025.

UDC [930:351](476)“17/19”

# EVOLUTION OF AUTHORITIES AND ADMINISTRATIVE BODIES ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE LATE XVIIIth – EARLY XXth CENTURIES: HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM

**A. Zhitko,**
*Doctor of History, Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Peoples Belarussian State Pedagogical University named after Maxim Tank;*

**S. Tolmacheva,**
*Doctor of History, Head of the Department of History of Belarus and Slavic Peoples Belarussian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 02.06.2025.

Артыкул з’яўляецца спробай гістарычнага асэнсавання вынікаў даследаванняў, прысвечаных стварэнню, функцыям, кадраваму складу і дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання на тэрыторыі Беларусі з 1772 па 1917 г. З гэтай мэты прааналізаваны працы, якія пабачылі свет у дарэвалюцыйны, савецкі і постсавецкі перыяды, а таксама ў замежных краінах. Устаноўлена, што абагульняючага гістарыяграфічнага даследавання ў форме манаграфіі ці калектыўнага выдання ў айчынным гістарычнай навуцы на сённяшні дзень не падрыхтавана.

*Ключавыя словы:* гістарыяграфія, органы ўлады і кіравання, праблема, эвалюцыя, айчынныя даследаванні, замежныя публікацыі, Беларусь.

The article is an attempt to historically comprehend the results of research on the creation, functions, personnel and activities of local governmental authorities and administrative bodies in Belarus from 1772 to 1917. For this purpose, works published in the pre-revolutionary, soviet and post-soviet periods and also in foreign countries were analyzed. It was established that a general historiographic study in the form of a monograph or collective publication in domestic historical science has not been prepared to date.

*Keywords:* historiography, authorities and administrative bodies, problem, evolution, domestic research, foreign publications, Belarus.

*Уводзіны.* У апошнія дзесяцігоддзі стварэнне і дзейнасць асобных органаў дзяржаўнай улады, кіравання і грамадскага (саслоўнага і бессаслоўнага) самакіравання на беларускіх землях пад час іх знаходжання ў складзе Расійскай імперыі сталі прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і замежнай гістарычнай навуцы, што запаўняе прабелы ў палітычнай і сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі. Разам з тым, патрабуецца правядзенне даследавання, якое акумуліравала б усе структурныя элементы сістэмы мясцовай улады і кіравання, а тым больш – яе гістарыяграфічнае асэнсаванне. Зразумела, што ў кожнай навуковай працы па тым ці іншым пытанні прысутнічаюць раздзел ці асобная глава, прысвечаныя выяўленню ступені навуковай распрацаванасці праблемы ў гістарычнай навуцы, аднак абагульняючая гістарыяграфічная праца на ўзроўні манаграфіі ці калектыўнага выдання ў беларускай гістарычнай навуцы на сённяшні дзень адсутнічае.

*Асноўная частка.* У выніку трох падзелаў (1772, 1793, 1795 гг.) Рэчы Паспалітай беларускія землі апынуліся ў складзе Расійскай імперыі, урад якой імкнуўся ўніфікаваць далучаныя тэрыторыі з рускімі губернямі. Пры гэтым у правячых колах лічылася, што Беларускі край – гэта спрадвечна рускія землі. Гэтую думку павінны былі падмацаваць спецыяльнымі навуковымі даследаваннямі. У прыватнасці, адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне і стварэнне новых органаў улады і кіравання на беларускіх землях раскрываюцца ў шэрагу артыкулаў дарэвалюцыйнага даследчыка П. Жуковіча. Аўтар падрабязна паказаў не толькі працэс падрыхтоўкі размежавання далучаных тэрыторый, але і фактыч-

нае стварэнне новых губерняў і іх падзел на паветы. П. Жуковіч адзначаў, што Кацярына ІІ не паспела распаўсюдзіць дзеянне сістэмы губернскага судова-адміністрацыйнага кіравання на землі, далучаныя пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай, але яна змагла ўсё ж закласці грунтоўны падмурак для ўвядзення сістэмы кіравання губернямі [1].

У працы У. Л. Лехтанена прадметам спецыяльнага даследавання ўпершыню стала гісторыя беларускіх земель, якія адышлі да Расійскай імперыі па першым падзеле Рэчы Паспалітай, скрозь прызму мерапрыемстваў царскага ўрада па іх адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні ў 1772–1782 гг. [2]. Выкарыстоўваючы матэрыялы сенацкага архіва, гісторык разгледзеў комплекс мер па арганізацыі мясцовага кіравання і суда ў краі. У гэтым працэсе ён вылучыў два этапы. Першы (1772–1778 гг.) быў звязаны з папярэдняй арганізацыяй пераходнай сістэмы мясцовага кіравання і суда. Далучаныя тэрыторыі разглядаліся расійскім урадам як месца апрабацыі задуманых рэформаў у судова-адміністрацыйнай сферы. Пачатак другога этапу быў абумоўлены арганізацыяй у 1778 г. Магілёўскага і Полацкага намесніцтваў у адпаведнасці з рэформай 1775 г. Характарызуючы новую судова-адміністрацыйную сістэму і параўноўваючы яе з тым беспарадкам, які панаваў у Рэчы Паспалітай, гісторык зрабіў выснову, што ўключэнне ўсходне-беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі адыграла прагрэсіўную ролю.

У савецкай гістарыяграфіі праблемы дзяржаўнага кіравання амаль да сярэдзіны 1960-х гг. не з’яўляліся прадметам спецыяльнага вывучэння. У 1960 г. і ў 1964 г. А. Чарновым былі выдадзены матэрыялы даведачнага характару «Государственные учреждения России XVIII в.» і «Государственные учреждения России XIX – начала XX в.», дзе прыведзены звесткі аб заканадаўчых актах, апублікаваных у «Полном собрании законов Российской империи», а таксама аб стварэнні новых устаноў, іх структуры, функцыях, пераўтварэннях і ліквідацыі. У 1968 г. пад рэдакцыяй М. Ярошкіна быў выдадзены дапаможнік «История государственных учреждений дореволюционной России» [3] з прадстаўленнем не толькі інфармацыі аб установах, але і прычынах рэфармавання дзяржаўнага кіравання ў Расійскай імперыі.

Праблема дзяржаўнага кіравання нацыянальнымі ўскраінамі стала адной з ключавых у расійскай і замежнай гістарыяграфіі ў 1990-х гг. – пачатку ХХІ ст. Галоўнай прычынай такой з’явы стала тое, што ў гэты час у Расійскай Федэрацыі ўзмацніўся сепаратызм нацыянальных меншасцяў. Таму ўзнікла неабходнасць вывучэння мінулага вопыту. Позірк быў таксама скіраваны і на гісторыю адміністрацыі заходніх межаў Расійскай імперыі. З’явіўся шэраг калектыўных і манаграфічных выданняў, у якіх знайшлі адлюстраванне праблемы стварэння і функцыянавання адміністрацыйнага апарату Расійскай імперыі, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі. Да такіх прац адносяцца: «Западные окраины Российской империи» і «Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления», «Институт генерал-губернаторства и наместничества в Российской империи». Аўтарскія калектывы прасачылі змены ў сістэме кіравання і ва ўзаемаадносінах уладных структур з мясцовым насельніцтвам, скіраваных на ўніфікацыю далучаных тэрыторый з цэнтральным рэгіёнам імперыі, у тым ліку беларускіх губернях, звязаўшы іх з паўстаннямі, нацыянальнымі рухамі, далі прававую характарыстыку інстытута генерал-губернатарства [4].

У 90-х гг. ХХ – пачатку ХХІ ст. пытанні дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі на беларускіх землях многімі сучаснымі расійскімі гісторыкамі разглядаюцца з новых метадалагічных пазіцый. Праблему суадносін імперскіх і нацыянальных наратываў уздымае А. Мілер. У рабоце «Империя Романовых и национализм» ён адзначыў, што «отношения с регионализмом у историка должны строиться так же, как с национализмом, то есть с крайней настороженностью, чтобы не сорваться в эссенциализм» [5, с. 26]. Л. Гарызонтаў і А. Мілер паказалі непаслядоўнасць царскай палітыкі і перавагу бюракратычных метадаў у кіраванні на заходніх ускраінах імперыі [6]. Дыскурс, звязаны з нацыянальна-канфесійнай палітыкай урада Расійскай імперыі, працягвае М. Д. Далбілаў у грунтоўным даследаванні «Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II» [7]. Аналізуючы рэалізацыю палітыкі русіфікацыі, аўтар раскрывае дзейнасць не толькі генерал-губернатараў, але і чыноўнікаў мясцовай адміністрацыі.

Г. Камзолава звярнула ўвагу на вялікую ролю інстытута Віленскага генерал-губернатарства ў кіраванні гэтай тэрыторыяй. На яе думку, шмат што залежала ад індывідуальнага падыходу кожнага генерал-губернатара, які акрэсліваў метады інтэграцыі краю з цэнтрам. Генерал-губернатар не столькі назіраў за адпрацаваным механізмам дзяржаўнай машыны, колькі сам наладжваў і накіроўваў яе ход [8].

Прадметам даследавання А. Бахтурынай стала эвалюцыя дзяржаўнага кіравання заходнімі губернямі імперыі на пачатку ХХ ст. Аднак у полі яе зроку апынуліся пераважна палітычныя сістэмы Фінляндыі і Польшчы, у той час як заходнія губерні разгледжаны ў агульных рысах [9]. У сваім даследаванні А. Бахтурына прыйшла да высновы, што скасаванне Віленскага генерал-губернатарства было выклікана імкненнем уладаў ліквідаваць адмысловы адміністрацыйны статус заходніх губерняў, увесці ў іх земскія ўстановы. Адносна шырокая характарыстыка заканадаўчай базы фарміравання і функцыяна-

вання органаў мясцовага кіравання была зроблена ў працы расійскага даследчыка М. Краснякова [10]. Рэгіянальная спецыфіка мясцовага кіравання і самакіравання закранута ў даследаваннях А. Іёнавай, Л. Лапцевай, Б. Міронава [11].

Не абыходзілі пытанні аб ўсталяванні расійскай сістэмы кіравання на далучаных тэрыторыях і такія беларускія гісторыкі, як В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, У. Пічэта [12]. Асноўным кірункам царскай палітыкі ў перыяд праўлення Кацярыны ІІ і Паўла І прысвечана праца М. Ільяшэвіча [13]. Усталяванне, сутнасць і эвалюцыя адміністрацыйных органаў улады на далучанай тэрыторыі разглядаліся пераважна ў абагульняючых працах беларускіх гісторыкаў, такіх, напрыклад, як «Гісторыя Беларускай ССР» [14].

Неабходна адзначыць, што ў апошнія дзесяцігоддзі праблемы кіравання і самакіравання на тэрыторыі беларускіх губерняў у складзе Расійскай імперыі выклікаюць павышаную цікавасць сярод айчынных навукоўцаў – як гісторыкаў, так і юрыстаў-прававедаў. У 90-х гг. ХХ – пачатку ХХІ ст. пабачылі свет акадэмічныя выданні «Нарысы гісторыі Беларусі», «Гісторыя Беларусі» [15], «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» (у 2 кн., кн. 1) [16], «Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг.» [17], «История белорусской государственности» (у 5 т., т. 2) [18], «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)» [19] і інш. Так, у «Нарысах гісторыі Беларусі» была зроблена спроба па-новаму асэнсаваць нацыянальную гісторыю Беларусі. На думку аўтараў, з далучэннем беларускіх зямель да Расійскай імперыі быў пакладзены канец феадальнай анархіі, аднак царскі ўрад не прызнаваў існавання беларускага этнасу, а этнічныя і моўныя аспекты пры правядзенні тэрытарыяльна-адміністрацыйных межаў не ўлічваліся [15, с. 329].

С. Токць прадметам свайго даследавання выбраў мясцовы дзяржаўны апарат Міністэрства ўнутраных спраў і яго кадравы склад у 30–60-х гг. XIX ст. [20] А. Кісялёў прааналізаваў стварэнне новых органаў кіравання з часоў імператара Паўла І да сярэдзіны XIX ст., выявіў іх функцыі, а таксама склад чыноўнікаў [21]. Пры гэтым ён, у асноўным, акцэнтаваў увагу на мясцовых органах Міністэрства ўнутраных спраў і суда. Органы гаспадарча-эканамічнага кіравання засталіся па-за ўвагай аўтара. Гэты прабел у пэўнай ступені запаўняюць даследаванні А. Падарожняй, І. Трасцян, В. Крапівіна, І. Пугача, А. Давыдоўскага, Т. Осіпавай, К. Тарановіч. Так, А. Падарожняя раскрыла эвалюцыю органаў улады і кіравання ў беларускіх губернях з 1861 па 1914 г. Аўтар пераканаўча даказала, што ў пачатку XX ст. улада віленскіх генерал-губернатараў паступова саступала ў бок умацавання функцый грамадзянскіх губернатараў, што сведчыла аб уніфікацыі кіравання ў паўночна-заходніх і цэнтральных рускіх губернях [22].

Прадметам даследаванняў І. Трасцян з’явілася эвалюцыя ўлады генерал-губернатараў, ваенных і грамадзянскіх губернатараў і губернскіх праўленняў на тэрыторыі Беларускага края з 1772 па 1856 г. Аўтар пераканаўча даказала, што наяўнасць улады генерал-губернатараў і ваенных губернатараў у беларускіх губернях была выклікана памежным становішчам беларускага рэгіёну, унутры- і знешнепалітычным становішчам, поліканфесійным і поліэтнічным складам насельніцтва [23].

В. Крапівін раскрыў месца і ролю палат і ўпраўленняў дзяржаўных маёмасцяў у сацыяльна-эканамічным развіцці беларускіх губерняў з 1839 па 1914 г., паказаў іх уклад у ажыццяўленне рэформы П. Д. Кісялёва, рэформы дзяржаўнай вёскі ў 1867 г., папулярызацыю перадавых тэхналогій у земляробстве і жывёлагадоўлі, правядзенне меліярацыйных работ на тэрыторыі Беларусі [24].

Дзейнасць казённых палат, лясных аддзяленняў палат і ўпраўленняў дзяржаўных маёмасцяў, лесаахоўных камітэтаў па ахове і зберажэнні лясных багаццяў, а таксама кадравы склад і функцыяванне лясной варты ў Беларусі з 1772 па 1914 г. сталі прадметам даследаванняў І. Пугача [25].

Тэмай дысертацыі А. Давыдоўскага з’явіліся роля і месца казённых палат, інстытута падатковай інспекцыі, павятовых і губернскіх распарадчых камітэтаў у мадэрнізацыі падатковай сістэмы, ацэнцы нерухомай маёмасці, раскладцы і зборы прамых падаткаў у Беларускім рэгіёне ў 1885–1914 гг. [26].

Т. Осіпава першай у айчыннай гістарыяграфіі прааналізавала стварэнне і дзейнасць фабрычнай інспекцыі па рэгуляванні ўзаемаадносін паміж рабочымі і прадпрымальнікамі на прадпрыемствах цэнзавай прамысловасці ў Беларусі з 1882 па 1914 г. [27].

К. Тарановіч раскрыла дзяржаўны механізм кіравання па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы. Выявіла асаблівасці фарміравання кадравага складу павятовых і губернскіх землеўпарадкавальных камісій, эвалюцыю іх функцый па землеўпарадкаванні і выніковасць дзейнасці [28].

У 2017 г. А. Страленя абараніла кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную дзейнасці земскіх начальнікаў у Беларусі [29]. Аднак роля земскіх начальнікаў у рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы не знайшла належнага адлюстравання. Па-за ўвагай даследчыцы засталіся праблемы функцыявання павятовых з’ездаў земскіх начальнікаў.

Т. Даўгач прысвяціла сваё дысертацыйнае даследаванне аналізу структуры, функцый і дзейнасці губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцяў. У дысертацыі і публікацыях разглядаецца практычная дзейнасць названых устаноў па рэалізацыі аграрных рэформ і пазямельным уладкаванні розных катэгорый сельскага насель-

ніцтва. Разам з тым, аўтар не акцэнтавала ўвагу на зменах у структуры губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцяў, якія адбыліся ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях у адпаведнасці з законам ад 27 чэрвеня 1874 г. [30].

Асобным аспектам дзейнасці міравых пасрэднікаў Беларусі прысвяцілі свае публікацыі А. С. Серада [31] і С. Л. Лугаўцова [32]. С. Лонская на падставе аналізу судовых функцый міравых пасрэднікаў прыйшла да высновы, што «этот институт представлял собой аналог классической модели мировой юстиции» [33, с. 13].

С. Талмачова комплексна даследавала фарміраванне і дзейнасць спецыяльна створаных мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў і мадэрнізацыі сельска-гаспадарчай вытворчасці ў 1861–1914 гг. Аўтар упершыню ў гістарычнай навуцы вылучыла і абгрунтавала два этапы ў палітыцы расійскага ўрада ў дачыненні да сельскага насельніцтва. Першы этап адпавядае храналагічным межам 1861–1906 гг., калі аб’ектам дадзенай палітыкі з’яўлялася сельская абшчына. Другі этап прыпадае на 1906–1914 гг. – гэта час, калі аб’ектам становіцца асоба селяніна з наданнем яму ўсіх грамадзянскіх правоў, у тым ліку права набыцця надзельнай зямлі ў асабістую прыватную ўласнасць [34, л. 44–45].

Палітыка расійскага ўрада ў галіне фарміравання кадравага складу органаў дзяржаўнага кіравання на тэрыторыі Беларусі знайшла сваё адлюстраванне ў манаграфіі А. Жытко [35]. Сацыякультурны воблік чыноўніцтва ў беларускіх губернях прааналізаваны А. Кузьміным [36].

Польскія гісторыкі традыцыйна праяўляюць цікавасць да шэрагу праблем гісторыі Беларусі, аднак прадметам іх даследаванняў, у асноўным, з’яўляецца палітыка самадзяржаўя ў сувязі з паўстаннямі 1794 г., 1830–1831 гг., 1863–1864 гг. і фарміраваннем адміністрацыйнага апарату, закліканага праводзіць рэпрэсіўную палітыку ў адносінах да мясцовага каталіцкага насельніцтва [37].

У заходняй гістарыяграфіі праблема адміністрацыйнага ўладкавання разглядалася ў рамках кіравання рознымі тэрыторыямі Расійскай імперыі. Фокус даследавання перамяшчаўся з цэнтра на перыферыю. На Захадзе яшчэ ў 1960–1980-я гг. урадавы апарат Расійскай імперыі, яго колькасны і сацыяльны склад вывучаліся ў рамках «новай палітычнай гісторыі». Гэтую дысцыпліну адрознівала цікавасць да функцыянавання сацыяльных структур і ўладных механізмаў, да палітычнай культуры рускіх чыноўнікаў. У цэнтры ўвагі знаходзіліся розныя аспекты фарміравання органаў кіравання на месцах. У апошнія дзесяцігоддзі, па словах вядомага амерыканскага гісторыка П. Верта, сучасную замежную гістарыяграфію цікавяць пытанні ўзаемадзеяння цэнтра і перыферыі, розных груп насельніцтва, нявызначанасць працэсаў фарміравання нацыянальных ідэнтычнасцяў, г. зн. менавіта імперская складовая расійскай гісторыі [38, с. 10]. П. Верт разглядае феномен поліканфесійнасці Расійскай імперыі праз прызму імперскага ладу і кіравання ў XIX – пачатку XX ст. [39]. У адным са сваіх артыкулаў аўтар слушна звярнуў увагу на тое, што ў гістарыяграфіі пры апісанні ўзаемаадносін імперскага цэнтра і мясцовага насельніцтва дамінавала «парадигма открытого сопротивления» [40, с. 50]. П. Верт лічыць неабходным больш увагі надаваць пасіўнай апазіцыйнасці мясцовых нацыянальных супольнасцяў у дачыненні да розных ініцыятыў імперскага цэнтра [40, с. 16–17, 48–83]. А. Рэнер у артыкуле «Изобретающее воспоминание» паставіў пытанне аб сувязі нацыянальнай палітыкі ў 1860-я гг. з крызісам рэформ царызму, якія адбываліся ў той час [41].

У адной са сваіх публікацый Н. Вейсман зрабіў заключэнне, што напачатку XX ст. пераўтварэнні мясцовага адміністрацыйнага апарату набылі ключавое значэнне для кіруючага рэжыму, паколькі гаворка ішла пра забеспячэнне таго мінімуму кіравання, без якога краіна не магла існаваць [42]. Гэту думку падтрымаў Т. Персон, які паказаў, што рэфармаванне мясцовага кіравання з’яўлялася індыкатарам стану Расійскай імперыі і мела велізарнае значэнне для выжывання царскага рэжыму [43]. У 1980-я гг. гісторык Р. Робінс [44] вывучаў пытанні дзейнасці і пасрэдніцкай ролі губернатараў паміж цэнтральнай і мясцовай бюракратыяй, функцыянаванне мясцовай адміністрацыйнай машыны, адносіны губернатараў са сваімі падначаленнымі і сацыяльнымі інстытутамі, якія не былі пад іх прамым кантролем, сродкі і спосабы забеспячэння парадку ў губерні. Прадметам даследавання аўтара з’яўляліся асноўныя механізмы функцыянавання адміністрацыйных структур вялікарасійскіх губерняў, што было характэрна і для беларускіх земляў.

Маштабным даследаваннем па тэме з’яўляюцца працы амерыканскага даследчыка Т. Уікса. Аўтар вылучыў «западные окраины» як рэгіён, дзе склалася цэласная сістэма органаў дзяржаўнага кіравання, якая мела і свае асаблівасці. У прыватнасці, ён даследаваў пытанні ўвядзення земства ў Заходнім краі [45]. Да важных высноў адносна арганізацыі сістэмы кіравання прыйшоў даследчык С. Бекер. На яго думку, для рашэння спецыфічных адміністрацыйных праблем заходніх губерняў імперыі дзейнічаў інстытут генерал-губернатарства, які спрыяў іх інтэграцыі ў імперыю. Ён адзначаў, што адной з ключавых задач функцыянавання інстытута генерал-губернатарства ў гэтых губернях з’яўлялася падтрымка ўнутранай і знешняй бяспекі імперыі [46].

*Заключэнне.* У беларускай і замежнай гістарыяграфіі актыўна працягваецца вывучэнне сістэмы мясцовых органаў улады і дзяржаўнага

кіравання. Аднак на сённяшні дзень абагульняючай работы, прысвечанай эвалюцыі мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, у Беларусі не створана. Асобныя сюжэты знайшлі адлюстраванне ў даследаваннях, якія прысвечаны працэсам мадэрнізацыі, сацыяльна-эканамічнай гісторыі, палітыцы самадзяржаўя ў краі і г. д. У апошнія дзесяцігоддзі айчынныя навукоўцы падверглі даследаванню асобна ўзятыя мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання з 1772 па 1917 г. Сучасная заходняя гістарычная навука звярнулася да даследавання бюракратыі і дзяржапарату пачатку XX ст. Адначасова ў працах амерыканскіх гісторыкаў ставіцца пытанне пра недахоп адпаведных навуковых даследаванняў, з'яўленне якіх «цалкам можа змяніць наша ўспрыманне праблем позняй Расійскай імперыі і яе перспектыў» [47, с. 8].

### *Літаратура і крыніцы*


1. *Жукович, П.* Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II / П. Жукович // Журнал министерства народного просвещения. – 1914. – № 2. – С. 265–315; № 3 – С. 88–120; № 4. – С. 314–355; № 5. – С. 1–43; Ён жа. Сословный состав Западной России в царствование Екатерины / П. Жукович // Журнал министерства народного просвещения. – 1915. – № 1. – С. 76–109; № 2 – С. 257–321; № 5. – С. 130–178; Ён жа. Россия в царствование императора Павла I / П. Жукович // Журнал министерства народного просвещения. 1916. – № 6. – С. 183–226; № 8. – С. 207–263; № 9. – С. 186–275.
2. *Lehtonen, U. L.* Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782: Versuch einer Darstellung der anfänglichen Beziehungen der russischen Regierung zu ihren polnischen Untertanen / U. L. Lehtonen. – Berlin : Georg Reimer, 1907. – 634 s.
3. *Ерошкин, Н. П.* История государственных учреждений дореволюционной России / Н. П. Ерошкин. – 3-е изд., переработ. и доп. – М. : Высш. школа, 1983. – 352 с.
4. Западные окраины Российской империи / под ред. А. Миллера. – М. : Новое литературное обозрение, 2007. – 608 с.; Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления / отв. ред. С. Г. Агаджанов, В. В. Трепавлов. – М. : Славянский диалог, 1998. – 416 с.; Институт генерал-губернаторства и наместничества в Российской империи = The institute of governors-general and deputies in the russian empire : в 2 т / Т. А. Алексеева, В. Г. Афанасьев, В. В. Берсенев [и др.] ; под ред. В. В. Черкесова. – СПб. : Юрид. центр Пресс, 2003. – 2 т.
5. *Миллер, А. И.* Империя Романовых и национализм: эссе по методологии исторического исследования / А. И. Миллер. – М. : Новое литературное обозрение, 2008. – 248 с.
6. Г*оризонтов, Л. Е.* Парадоксы имперской политики: Поляки в России и русские в Польше. – М. : Индрик, 1999. – 270 с. – С. 49, 51–59; Миллер, А. И. «Украинский вопрос» в политике властей и русском общественном мнении (вторая половина XIX в.) / А. И. Миллер. – СПб. : Алетейя, 2000. – 267, [1] с., [6] л портр., карт.– С. 139–150; 233–236.
7. *Долбилов, М. Д.* Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов ; Гос. ун-т. высш. шк. экономики, фак. истории. – М. : Новое литературное обозрение, 2010. – 999 с.
8. *Комзолова, А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М. : Наука, 2005. – 383 с.
9. *Бахтурина, А. Ю.* Государственное управление западными окраинами Российской империи: 1905 – февраль 1917 г. : дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / Бахтурина Александра Юрьевна. – М., 2006. – 545 с.
10. *Красняков, Н. И.* Западные национальные регионы в системе государственного управления Российской империи в XVIII – начале XX в. Закрепление автономистской традиции в российской государственности: монография / Н. И. Красняков. – Екатеринбург : Изд-во УрАГС, 2009. – 208 с.


### *References*


1. *Zhukovich, P.* Upravlenie i sud v Zapadnoj Rossii v carstvovanie Ekateriny II / P. Zhukovich // Zhurnal ministerstva narodnogo prosveshcheniya. – 1914. – № 2. – S. 265–315; № 3 – S. 88–120; № 4. – S. 314–355; № 5. – S. 1–43; Yon zha. Soslovnyj sostav Zapadnoj Rossii v carstvovanie Ekateriny / P. Zhukovich // Zhurnal ministerstva narodnogo prosveshcheniya. – 1915. – № 1. – S. 76–109; № 2 – S. 257–321; № 5. – S. 130–178; Yon zha. Rossiya v carstvovanie imperatora Pavla I / P. Zhukovich // Zhurnal ministerstva narodnogo prosveshcheniya. 1916. – № 6. – S. 183–226; № 8. – S. 207–263; № 9. – S. 186–275.
2. *Lehtonen, U. L.* Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782: Versuch einer Darstellung der anfänglichen Beziehungen der russischen Regierung zu ihren polnischen Untertanen / U. L. Lehtonen. – Berlin : Georg Reimer, 1907. – 634 s.
3. *Eroshkin, N. P.* Istoriya gosudarstvennyh uchrezhdenij dorevolyucionnoj Rossii / N. P. Eroshkin. – 3-e izd., pererab. i dop. – M. : Vyssh. shkola, 1983. – 352 s.
4. Zapadnye okrainy Rossijskoj imperii / pod red. A. Millera. – M. : Novoe literaturnoe obozrenie, 2007. – 608 s.; Nacional'nye okrainy Rossijskoj imperii: stanovlenie i razvitie sistemy upravleniya / otv. red. S. G. Agadzhanov, V. V. Trepavlov. – M. : Slavyanskij dialog, 1998. – 416 s.; Institut general-gubernatorstva i namestnichestva v Rossijskoj imperii = The institute of governors-general and deputies in the russian empire : v 2 t / T. A. Alekseeva, V. G. Afanas'ev, V. V. Bersenev [i dr.] ; pod red. V. V. Cherkesova. – SPb. : Yurid. centr Press, 2003. – 2 t.
5. *Miller, A. I.* Imperiya Romanovyh i nacionalizm: esse po metodologii istoricheskogo issledovaniya / A. I. Miller. – M. : Novoe literaturnoe obozrenie, 2008. – 248 s.
6. *Gorizontov, L. E.* Paradoksy imperskoj politiki: Polyaki v Rossii i russkie v Pol'she. – M. : Indrik, 1999. – 270 s. – S. 49, 51–59; Miller, A. I. «Ukrainskij vopros» v politike vlastej i russkom obshchestvennom mnenii (vtoraya polovina HIH v.) / A. I. Miller. – SPb. : Aletejya, 2000. – 267, [1] s., [6] l portr., kart.– S. 139–150; 233–236.
7. *Dolbilov, M. D.* Russkij kraj, chuzhaya vera: etnokonfessional'naya politika imperii v Litve i Belorussii pri Aleksandre II / M. D. Dolbilov ; Gos. un-t. vyssh. shk. ekonomiki, fak. istorii. – M. : Novoe literaturnoe obozrenie, 2010. – 999 s.
8. *Komzolova, A. A.* Politika samoderzhaviya v Severo-Zapadnom krae v epohu Velikih reform / A. A. Komzolova. – M. : Nauka, 2005. – 383 s.
9. *Bahturina, A. Yu.* Gosudarstvennoe upravlenie zapadnymi okrainami Rossijskoj imperii: 1905 – fevral' 1917 g. : dis. … d-ra ist. nauk : 07.00.02 / Bahturina Aleksandra Yur'evna. – M., 2006. – 545 s.
10. *Krasnyakov, N. I.* Zapadnye nacional'nye regiony v sisteme gosudarstvennogo upravleniya Rossijskoj imperii v XVIII – nachale XX v. Zakreplenie avtonomistskoj tradicii v rossijskoj gosudarstvennosti: monografiya / N. I. Krasnyakov. – Ekaterinburg : Izd-vo UrAGS, 2009. – 208 s.

11. *Ионова, А. И.* Региональные особенности организации управления и государственной службы в Российской Империи / А. И. Ионова ; Рос. акад. гос. службы при Президенте Рос. Федерации. – М. : РАГС, 2001. – 75 с.; Лаптева, Л. Е. Региональное и местное управление в России (вторая половина XIX века) / Л. Е. Лаптева ; Акад. правовой ун-т при Ин-те государства и права Рос. акад. наук. – М. : Ин-т государства и права, 1998. – 151 с.; Миронов, Б. Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.) : Генезис личности, демократической семьи, гражданского общества и правового государства : в 2 т. / Б. Н. Миронов. – 2-е изд., испр. – СПб. : Дмитрий Булавин, 2000. – Т. 1–2 і інш.
12. *Ластоўскі, В. Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі: з 40 рысункамі / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 124, [2] с. : іл., партр., факсім.; Ігнатоўскі, У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця: лекцыі, чытаныя студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту / У. Ігнатоўскі. – Менск [Мінск] : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925. – 251, [1] с. : іл., партр., факсім.; Ігнатоўскі, У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі: лекцыі, чытаныя на курсах лектараў беларусазнаўства / У. Ігнатоўскі. – Выд. 2-е. – Менск [Мінск] : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1921. – 126 с.; Пічэта, У. Гісторыя Беларусі / У. І. Пічэта. – Мінск : Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 2005. – 178, [1] с.
13. *Ільяшэвіч, М.* Расійская палітыка на землях былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панавання Кацярыны II і Паўла I (1772–1801) / М. Ільяшэвіч. – Вільня : [б. в.], 1933. – 24 с.
14. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. Т 1 : Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму / Акадэмія навук БССР, Інстытут гісторыі; гал. рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 632 с.
15. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / Акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 1. – 1994. – 527 с.; Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – 519 с.
16. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад навук Беларусі; Ін-т гісторыі. – Мінск, 2011. – 584 с.
17. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2018. – 572 с., іл.
18. История белорусской государственности : в 5 т. Т. 2 : Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.) / Н. В. Смехович [и др.] ; отв. ред. тома: Н. В. Смехович, А. В. Унучек, Е. Н. Филатова ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2019. – 413 с.
19. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII — пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2020. – 684 с.
20. *Токць, С. М.* Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Токць Сяргей Міхайлавіч ; Акад. навук Беларусі ; Ін-т гісторыі. – Мінск, 1997. – 136 л.
21. *Киселев, А. А.* Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. : монография / А. А. Киселев. – Минск : Военная академия Республики Беларусь, 2007. – 171 с.

11. *Ionova, A. I.* Regional'nye osobennosti organizacii upravleniya i gosudarstvennoj sluzhby v Rossijskoj Imperii / A. I. Ionova ; Ros. akad. gos. sluzhby pri Prezidente Ros. Federacii. – M. : RAGS, 2001. – 75 s.; Lapteva, L. E. Regional'noe i mestnoe upravlenie v Rossii (vtoraya polovina HIH veka) / L. E. Lapteva ; Akad. pravovoj un-t pri In-te gosudarstva i prava Ros. akad. nauk. – M. : In-t gosudarstva i prava, 1998. – 151 s.; Mironov, B. N. Social'naya istoriya Rossii perioda imperii (XVIII – nachalo XX v.) : Genezis lichnosti, demokraticheskoj sem'i, grazhdanskogo obshchestva i pravovogo gosudarstva : v 2 t. / B. N. Mironov. – 2-e izd., ispr. – SPb. : Dmitrij Bulavin, 2000. – T. 1–2 i insh.
12. *Lastoŭski, V. Yu.* Karotkaya gistoryya Belarusi: z 40 rysunkami / V. Yu. Lastoŭski. – Minsk : Universiteckae, 1992. – 124, [2] s. : il., partr., faksim.; Ignatoŭski, U. Gistoryya Belarusi ŷ XIX i ŭ pachatku XX staleccya: lekcyi, chytanyya studentam Belaruskaga dzyarzhaŭnaga ŭniversitetu / U. Ignatoŭski. – Mensk [Minsk] : Dzyarzhaŭnae vydavectva Belarusi, 1925. – 251, [1] s. : il., partr., faksim.; Ignatoŭski, U. M. Karotki narys gistoryi Belarusi: lekcyi, chytanyya na kursah lektaraŭ belarusaznaŭstva / U. Ignatoŭski. – Vyd. 2-e. – Mensk [Minsk] : Dzyarzhaŭnae vydavectva Belarusi, 1921. – 126 s.; Picheta, U. Gistoryya Belarusi / U. I. Picheta. – Minsk : Vydavecki centr Belaruskaga dzyarzhaŷnaga universiteta, 2005. – 178, [1] s.
13. *Il'yashevich, M.* Rasijskaya palityka na zemlyah byloga Belaruska-Litoŭskaga gaspadarstva za panavannya Kacyaryny II i Paŭla I (1772–1801) / M. Il'yashevich. – Vil'nya : [b. v.], 1933. – 24 s.
14. Gistoryya Belaruskaj SSR : u 5 t. T 1 : Pershabytnaabshchynny lad na terytoryi Belarusi. Epoha feadalizmu / Akademiya navuk BSSR, Instytut gistoryi; gal. redkal.: I. M. Ignacenka (starshynya) [i insh.]. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1972. – 632 s.
15. Narysy gistoryi Belarusi : u 2 ch. / Akademiya navuk Belarusi, Instytut gistoryi. – Minsk : Belarus', 1994–1995. – Ch. 1. – 1994. – 527 s.; Gistoryya Belarusi : u 6 t. – T. 4 : Belarus' u skladze Rasijskaj imperyi (kanec XVIII – pachatak HH st.) / M. Bich, V. Yanoŷskaya, S. Rudovich [i insh.] ; redkal.: M. Kascyuk (gal. red.) [i insh]. – Minsk : Ekaperspektyva, 2005. – 519 s.
16. Gistoryya belaruskaj dzyarzhaŷnasci ŭ kancy XVIII – pachatku HHI st. : u 2 kn. – Kn. 1 / A. A. Kavalenya [i insh.] ; redkal.: A. A. Kavalenya [i insh.] ; Nac. akad navuk Belarusi; In-t gistoryi. – Minsk, 2011. – 584 s.
17. Gramadska-palitychnae zhyccyo ŷ Belarusi, 1772–1917 gg. / A. U. Unuchak [i insh.] ; redkal.: V. V. Danilovich (gal. red.) [i insh.] ; Nac. akad. navuk Belarusi, In-t gistoryi. – Minsk, 2018. – 572 s., il.
18. Istoriya belorusskoj gosudarstvennosti : v 5 t. T. 2 : Belorusskaya gosudarstvennost' v period Rossijskoj imperii (konec XVIII – nachalo HH v.) / N. V. Smekhovich [i dr.] ; otv. red. toma: N. V. Smekhovich, A. V. Unuchek, E. N. Filatova ; Nac. akad. nauk Belarusi, In-t istorii. – Minsk : Belarus. navuka, 2019. – 413 s.
19. Sacyyal'na-ekanamichnae razviccyo Belarusi (kanec XVIII — pachatak XX st.) / V. V. Yanoŷskaya [i insh.] ; redkal.: V. V. Danilovich (gal. red.) [i insh.] ; Nac. akad. navuk Belarusi, In-t gistoryi. – Minsk, 2020. – 684 s.
20. *Tokc', S. M.* Dzyarzhaŭny aparat caryzmu ŷ Belarusi ŷ 30–60-ya gg. HIH st. (struktura, funkcyi, chynoŷnicki korpus) : dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / Tokc' Syargej Mihajlavich ; Akad. navuk Belarusi ; In-t gistoryi. – Minsk, 1997. – 136 l.
21. *Kiselev, A. A.* Sistema upravleniya i chinovnichestvo belorusskih gubernij v konce XVIII – pervoj polovine XIX v. : monografiya / A. A. Kiselev. – Minsk : Voennaya akademiya Respubliki Belarus', 2007. – 171 s.

22. *Подорожняя, Е. А.* Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.): структура, функции, кадры : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Подорожняя Елена Александровна. – Минск, 2014. – 180 л.
23. *Трестьян, И. Н.* Эволюция местных органов государственной власти на территории Беларуси (1772–1856 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Трестьян Ирина Николаевна. – Минск, 2018. – 243 с.
24. *Крапивин, В. С.* Учреждения государственных имуществ на территории Беларуси (1839–1914 гг.): дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Крапивин Василий Сергеевич. – Минск, 2021. – 242 с.
25. *Пугач І. В.* Дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання па ахове лясоў у Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Пугач Іван Валянцінавіч. – Минск, 2020. – 251 с.
26. *Давыдовский, А. В.* Создание и деятельность института податной инспекции на территории Беларуси в 1885–1914 гг. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Давыдовский Александр Валерьевич. – Минск, 2024. – 303 с.
27. *Осіпава, Т. М.* Дзяржаўнае рэгуляванне ўзаемаадносін паміж прамысловымі рабочымі і прадпрымальнікамі ў Беларусі (1882–1914 гг.) : дыс. … канд. гістар. навук : 07.00.02 / Осіпава Таццяна Мікалаеўна. – Минск, 2014. – 224, [1] л.
28. *Таранович, К. Ю.* Деятельность землеустроительных комиссий по реализации столыпинской аграрной реформы в Беларуси (1906–1917 гг.) : дис. … канд. истор. наук : 07.00.02 / Таранович Кристина Юрьевна. – Минск, 2016. – 239, [2] л.
29. *Страленя, А. А.* Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Анна Анатольвна Страленя. – Минск, 2017. – 169 л.
30. *Долгач, Т. В.* Губернские по крестьянским делам присутствия на территории Беларуси: формирование, структура, деятельность (1861–1903 гг.) : дис. …канд. ист. наук / Долгач Татьяна Валентиновна. – Минск, 2019. – 200 с.
31. *Середа, А. С.* Вклад мировых посредников в развитие крестьянского образования в белорусских губерниях во второй половине XIX – начале XX века / А. С. Середа // Вышэйшая школа. – 2018. – № 4. – С. 41–46.
32. *Луговцова, С. Л.* Крестьянская реформа в Беларуси в воспоминаниях мировых посредников / С. Л. Луговцова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск, 2012. – Вып. 7. – С. 37–48.
33. *Лонская, С. В.* Мировые посредники крестьянской реформы 1861 г. как аналог института мировой юстиции / С. В. Лонская // Вес. Гродз. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Сер. 4, Правазнаўства. – 2009. – № 2. – С. 13–18.
34. *Талмачова, С. А.* Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861—1914 гг.) : дыс. … д-ра гістар. навук : 07.00.02 / Талмачова Святлана Аляксандраўна. – Мінск, 2022. – Арк. 44–45; Талмачова, С. А. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.) : манаграфія / С. А. Талмачова. – Мінск : БДПУ, 2019. – 344 с
35. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. : манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
36. *Кузьмин, А. Д.* Социокультурный облик чиновничества белорусских губерний (1864–1914 гг.) : монография / А. Д. Кузьмин. – Могилев : МГУП, 2017. – 187 с. : табл., схемы.

22. *Podorozhnyaya, E. A.* Mestnye organy gosudarstvennoj vlasti i upravleniya v Belarusi (1861–1914 gg.): struktura, funkcii, kadry : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Podorozhnyaya Elena Aleksandrovna. – Minsk, 2014. – 180 l.
23. *Trest'yan, I. N.* Evolyuciya mestnyh organov gosudarstvennoj vlasti na territorii Belarusi (1772–1856 gg.) : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Trest'yan Irina Nikolaevna. – Minsk, 2018. – 243 s.
24. *Krapivin, V. S.* Uchrezhdeniya gosudarstvennyh imushchestv na territorii Belarusi (1839–1914 gg.): dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Krapivin Vasilij Sergeevich. – Minsk, 2021. – 242 s.
25. *Pugach I. V.* Dzejnasc' organaŭ dzyarzhaŭnaga kiravannya pa ahove lyasoŭ u Belarusi (kanec XVIII – pachatak HH st.) : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Pugach Ivan Valyantinavich. – Minsk, 2020. – 251 s.
26. *Davydovskij, A. V.* Sozdanie i deyatel'nost' instituta podatnoj inspekcii na territorii Belarusi v 1885–1914 gg. : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Davydovskij Aleksandr Valer'evich. – Minsk, 2024. – 303 s.
27. *Osipava, T. M.* Dzyarzhaŭnae regulyavanne ŭzaemaadnosin pamizh pramyslovymi rabochymi i pradprymal'nikami ŭ Belarusi (1882–1914 gg.) : dys. … kand. gistar. navuk : 07.00.02 / Osipava Taccyana Mikalaeŭna. – Minsk, 2014. – 224, [1] l.
28. *Taranovich, K. Yu.* Deyatel'nost' zemleustroitel'nyh komissij po realizacii stolypinskoj agrarnoj reformy v Belarusi (1906–1917 gg.) : dis. … kand. istor. nauk : 07.00.02 / Taranovich Kristina Yur'evna. – Minsk, 2016. – 239, [2] l.
29. *Stralenya, A. A.* Deyatel'nost' zemskih nachal'nikov na territorii Belarusi (konec XIX v. – 1914 g.) : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / Anna Anatol'vna Stralenya. – Minsk, 2017. – 169 l.
30. *Dolgach, T. V.* Gubernskie po krest'yanskim delam prisutstviya na territorii Belarusi: formirovanie, struktura, deyatel'nost' (1861–1903 gg.) : dis. …kand. ist. nauk / Dolgach Tat'yana Valentinovna. – Minsk, 2019. – 200 s.
31. *Sereda, A. S.* Vklad mirovyh posrednikov v razvitie krest'yanskogo obrazovaniya v belorusskih guberniyah vo vtoroj polovine XIX – nachale XX veka / A. S. Sereda // Vyshejshaya shkola. – 2018. – № 4. – S. 41–46.
32. *Lugovcova, S. L.* Krest'yanskaya reforma v Belarusi v vospominaniyah mirovyh posrednikov / S. L. Lugovcova // Krynicaznaŭstva i specyyal'nyya gistarychnyya dyscypliny : navuk. zb. / Belaruski dzyarzhaŭny ŭniversitet. – Minsk, 2012. – Vyp. 7. – S. 37–48.
33. *Lonskaya, S. V.* Mirovye posredniki krest'yanskoj reformy 1861 g. kak analog instituta mirovoj yusticii / S. V. Lonskaya // Ves. Grodz. dzyarzh. un-ta imya Ya. Kupaly. Ser. 4, Pravaznaŭstva. – 2009. – № 2. – S. 13–18.
34. *Talmachova, S. A.* Myascovyya organy dzyarzhaŭnaga kiravannya pa realizacyi agrarnaj palityki rasijskaga ŭrada na terytoryi Belarusi (1861—1914 gg.) : dys. … d-ra gistar. navuk : 07.00.02 / Talmachova Svyatlana Alyaksandraŭna. – Minsk, 2022. – Ark. 44–45; Talmachova, S. A. Myascovyya organy dzyarzhaŭnaga kiravannya pa realizacyi agrarnaj palityki samadzyarzhaŷya na terytoryi Belarusi (1861–1914 gg.) : managrafiya / S. A. Talmachova. – Minsk : BDPU, 2019. – 344 s
35. *Zhytko, A. P.* Dvaranstva Belarusi peryyadu kapitalizmu. 1861–1914 gg. : managrafiya / A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2003. – 233 s.
36. *Kuz'min, A. D.* Sociokul'turnyj oblik chinovnichestva belorusskih gubernij (1864–1914 gg.) : monografiya / A. D. Kuz'min. – Mogilev : MGUP, 2017. – 187 s. : tabl., skhemy.

37. *Śliwowska, W.* Petersburg i społeczeństwo rosyjskie wobec kwestii polskiej w przededniu i w czasie powstania styczniowego / W. Śliwowska // Powstanie styczniowe 1863—1864: wrzenie, bój, Europa, wizje / pod red. S. Kalembki. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1990. – 760, [1] s.– S. 542–548; Fajnhaus, D. 1863. Litwa i Białoruś. – Warszawa, 1999 і інш.
38. Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет: антология / сост. П. Верт, П. С. Кабытов, А. И. Миллер. – М. : Новое издательство, 2005. – 696 с.
39. *Верт, Пол. В.* Православие, инославие, иноверие: очерки по истории религизного разнообразия Российской империи / Пол Верт ; [пер. с англ. Н. Мишаковой и др.]. – М. : Новое литературное обозрение, 2012. – 275 с.
40. *Верт, Пол В.* От «сопротивления» к «подрывной деятельности»: власть империи, противостояние местного населения и их взаимозависимость / Пол В. Верт // Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет: антология / сост. П. Верт, П. С. Кабытов, А. И. Миллер. – М. : Новое издательство, 2005. – 696 с.
41. *Реннер, А.* Изобретающее воспоминание // Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет : антология / сост. П. Верт, П. С. Кабытов, А. И. Миллер. – М. : Новое издательство, 2005. – 696 с.
42. *Weissman, N. B.* Reform in Tsarist Russia. The State Bureaucracy and Local Government, 1900–1914 / N. B. Weissman // New Brunswick, New Jersey : Rutgers University Press, 1981. – 292 p.
43. *Pearson, T. S.* Russian Officialdom in Crisis. Autocracy and Local Self-Government, 1861–1900 / T. S. Pearson. Cambridge: Cambridge University Press, 1989. – 246 p.
44. *Robbins, R. G.* The Tsar's Viceroys. Russian Provincial Governors in the Last Years of the Empire / R. G. Robbins. – Ithaca and London : Cornell Univ Pr, 1987. – 328 p.
45. *Weeks, T. R.* Nation and the State in late imperial Russia: Nationalism and Russification on the Western frontier, 1863–1914 / T. R.Weeks. – DeKalb : Northern Illinois univ. press, 1996. – [7], 297 p.; Weeks, T. Russification and the Lithuanians, 1863–1905 / T. R.Weeks // Slavic review. – Chicago, 2001. – Vol. 60. – № 1. – P. 96–114.
46. *Becker, S.* Russia and theconcept of Empire / S. Becker // Ab imperio. – Казань, 2000. – № 3/4. – С. 329–342.
47. Late imperial Russia. Problems and prospects / Ed. by I. D. Thatcher. – Manchester and New York : Manchester University Press, 2005. – 224 p.

37. *Śliwowska, W.* Petersburg i społeczeństwo rosyjskie wobec kwestii polskiej w przededniu i w czasie powstania styczniowego / W. Śliwowska // Powstanie styczniowe 1863—1864: wrzenie, bój, Europa, wizje / pod red. S. Kalembki. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1990. – 760, [1] s.– S. 542–548; Fajnhaus, D. 1863. Litwa i Białoruś. – Warszawa, 1999 i insh.
38. Rossijskaya imperiya v zarubezhnoj istoriografii. Raboty poslednih let: antologiya / sost. P. Vert, P. S. Kabytov, A. I. Miller. – M. : Novoe izdatel'stvo, 2005. – 696 s.
39. *Vert, Pol. V.* Pravoslavie, inoslavie, inoverie: ocherki po istorii religiznogo raznoobraziya Rossijskoj imperii / Pol Vert ; [per. s angl. N. Mishakovoj i dr.]. – M. : Novoe literaturnoe obozrenie, 2012. – 275 s.
40. *Vert, Pol V.* Ot «soprotivleniya» k «podryvnoj deyatel'nosti»: vlast' imperii, protivostoyanie mestnogo naseleniya i ih vzaimozavisimost' / Pol V. Vert // Rossijskaya imperiya v zarubezhnoj istoriografii. Raboty poslednih let: antologiya / sost. P. Vert, P. S. Kabytov, A. I. Miller. – M. : Novoe izdatel'stvo, 2005. – 696 s.
41. *Renner, A.* Izobretayushchee vospominanie // Rossijskaya imperiya v zarubezhnoj istoriografii. Raboty poslednih let : antologiya / sost. P. Vert, P. S. Kabytov, A. I. Miller. – M. : Novoe izdatel'stvo, 2005. – 696 s.
42. *Weissman, N. B.* Reform in Tsarist Russia. The State Bureaucracy and Local Government, 1900–1914 / N. B. Weissman // New Brunswick, New Jersey : Rutgers University Press, 1981. – 292 r.
43. *Pearson, T. S.* Russian Officialdom in Crisis. Autocracy and Local Self-Government, 1861–1900 / T. S. Pearson. Cambridge: Cambridge University Press, 1989. – 246 r.
44. *Robbins, R. G.* The Tsar's Viceroys. Russian Provincial Governors in the Last Years of the Empire / R. G. Robbins. – Ithaca and London : Cornell Univ Pr, 1987. – 328 p.
45. *Weeks, T. R.* Nation and the State in late imperial Russia: Nationalism and Russification on the Western frontier, 1863–1914 / T. R.Weeks. – DeKalb : Northern Illinois univ. press, 1996. – [7], 297 p.; Weeks, T. Russification and the Lithuanians, 1863–1905 / T. R.Weeks // Slavic review. – Chicago, 2001. – Vol. 60. – № 1. – P. 96–114.
46. *Becker, S.* Russia and theconcept of Empire / S. Becker // Ab imperio. – Kazan', 2000. – № 3/4. – S. 329–342.
47. Late imperial Russia. Problems and prospects / Ed. by I. D. Thatcher. – Manchester and New York : Manchester University Press, 2005. – 224 p.